Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-11-22

# Ніякая справа не праходзіць бясследна

## А тым больш навуковая

**У апошнія гады сетка навуковых гурткоў для школьнікаў развіваецца і ў Нацыянальнай акадэміі навук. Аказваецца, ёсць шмат людзей, якім падабаецца працаваць з дзецьмі і перадаваць ім свой вопыт.**

А пачалося ўсё з таго, што ў 2009 годзе быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Мінскім дзяржаўным палацам дзяцей і моладзі. Першы гурток — "Практычная фізіялогія жывёл з элементамі эксперыментальнай медыцыны" — паявіўся на базе Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі. Станоўчы вопыт, а таксама перамогі дзяцей на канферэнцыях сталі імпульсам для развіцця сеткі гурткоў у Акадэміі навук.

"Для таго каб стаць членам гуртка, неабходна быць навучэнцам (8—11 класаў) або студэнтам малодшых курсаў і мець цвёрдае жаданне атрымаць новыя веды, "рабіць" навуку сваімі рукамі і працаваць у дружнай камандзе, — гаворыць старшыня Савета маладых вучоных НАН Беларусі Уладзімір Казбанаў. — Веды, якія атрымліваюць гуртkоўцы, спатрэбяцца ім незалежна ад выбранага прафесійнага шляху, бо планаванне, аналіз, інтэрпрэтацыя вынікаў, навыкі публічных выступленняў і аргументаваных абарон спатрэбяцца ў любой сферы дзейнасці".

Заняткі пад кіраўніцтвам сталых вучоных даваляюць дзецям зрабіць першыя крокі ў навуцы і інакш паглядзець на звыклы прадмет — фізіку, біялогію ці гісторыю, бо інфармацыю дзеці атрымліваюць, як кажуць, з першых рук. "Менавіта тут нараджаецца навуковы азарт і выпрабоўваюцца ўласныя сілы і магчымасці, — гаворыць Уладзімір Казбанаў. — Да таго ж заняткі даваляюць юным навукоўцам вызначыцца з прафесіяй у будучыні або звузіць кола інтарэсаў да пэўнай спецыяльнасці. Паступленне ва ўніверсітэт становіцца ўжо свядомым крокам да дасягнення сваёй мэты ці нават мары".

Да моманту паступлення гуртkоўцы, як правіла, ужо маюць і перамогі на міжнародных канферэнцыях, і публікацыі ў навуковых выданнях, таму сваю навуковую дзейнасць яны імкнуцца працягваць і ў ВНУ. Іх заўважаюць, запрашаюць у студэнцкія навуковыя таварыствы. "Усё гэта лішні раз падкрэслівае, што ніякая справа не праходзіць бясследна, а заўсёды з'яўляецца ўмовай для развіцця і росту як прафесійнага, так і кар'ернага", — адзначае Уладзімір Казбанаў.

Сам ён вядзе згаданы вышэй гурток "Практычная фізіялогія жывёл з элементамі эксперыментальнай медыцыны" на базе лабараторыі нейрафізіялогіі Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі. Вялікая колькасць розных тэматык (даследаванні імплантатаў, наначасціц, новых лекавых сродкаў, прадуктаў харчавання, новых матэрыялаў для медыцыны) прыцягвае школьнікаў, якія з задавальненнем ставяць эксперыменты ў адной з вядучых навуковых устаноў акадэміі навук у медыка-біялагічнай галіне. У гуртка ёсць прэстыжныя ўзнагароды, атрыманыя на міжнародных конкурсах, у тым ліку на ўсерасійскім конкурсе імя У.І.Вярнадскага ў Маскве (вясной 2012 года). Многія былыя гуртkоўцы ўжо вучацца ў медыцынскім універсітэце, у будучым годзе, трэба спадзявацца, паступяць таксама.

Далучыўшыся да вялікай навукі, дзеці жадаюць займацца гэтай справай і далей. А ў Акадэміі навук спадзяюцца, што калі-небудзь яны вернуцца сюды сапраўднымі даследчыкамі.

**Сёння ў Нацыянальнай акадэміі навук дзейнічаюць наступныя гурткі:**

- "Парламенцкія дэбаты і грамадская дыпламатыя";
- "Гісторык — даследчык";
- "Гісторыя і археалогія";
- "Практычная фізіялогія жывёл з элементамі эксперыментальнай медыцыны";
- "Правільнае харчаванне і здаровы лад жыцця";
- "Школа юнага фізіка";
- "Прыкладная фізіка";
- "Эксперыментальная батаніка і фізіялогія раслін";
- "Біялогія клеткі з элементамі біяфізікі".

*Інфармацыя аб гуртках змешчана на сайце www.ygc.by.*

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@ng-press.by*

Галіна Сідаровіч. Ніякая справа не праходзіць бясследна